4. Наливайко Н.В. Образовательный институт постмодерна в контекстах власти и общества знаний // Философские науки. – 2013. - № 11. – с. 150-152.
5. Нестеров Л.В. Гуманитаризация образования как важное средство формирования информационной культуры будущего специалиста // www.Superinf.ru – Дата выхода 10.04.2014

**Выступления:**

## ВЫКАРЫСТАННЕ ІНАВАЦЫЙНЫХ ПАДЫХОДАЎ ДА ВЫВУЧЭННЯ ГІСТОРЫІ Ў ВНУ

Багдановіч А. І. г. Мінск, БНТУ

Агульнавядома, што веды прыходзяць толькі да зацікаўленага чалавека. У народзе гавораць: “Той, хто жадае, робіць больш, чым той, хто можа”. Сучасны студэнт павінен умець самастойна арганізаваць сваю пазнавальную дзейнасць, актыўна ўключацца ў кагнетыўны працэс, у пошук разнастайнай навукова-тэхнічнай і грамадска-палітычнай інфармацыі, самастойна аналізаваць яе і адаптаваць да зменлівых умоў жыцця, прымаць рашэнні па выкарыстанні інфармацыі для дасягнення вучэбных і жыццевых мэт. Выкладчыкі, у сваю чргу, павінны ставіць перад сабой мэту забяспечыць станоўчую матывацыю навучання той дысцыпліны, якую яны выкладаюць, актывізаваць пазнавальную дзейнасць навучэнцаў у тым ліку і праз выкарыстання інавацыйных падыходаў да арганізацыі вучэбнага працэса.

Сучаснаму выкладчыку неабходна арыентавацца ў шырокім спектры сучасных інавацыйных тэхналогій, ідэй, школ і кірункаў. Г.К. Селеўко дае навуковае абгрунтаванне паняцця педагагічнай тэхналогіі, прапануе класіфікацыю і апісанне ў абагульненым выглядзе каля 50 разнастайных тэхналогій. Нягледзячы на тое, што большасць з апісаных тэхналогій прызначаецца для выкарыстання ў агульнаадукацыйных школах, яны могуць паспяхова выкарыстоўвацца і у ВНУ [6]. Інавацыі – гэта новаўвядзенні ў якой-небудзь вобласці чалавечага жыцця, або нязменны атрыбут

прагрэсіўнага развіцця грамадства. Інавацыйны працэс у адукацыі цесна звязаны з даследчай дзейнасцю. У сучасным інфармацыйным грамадстве чалавек пастаўлены ва ўмовы, калі ён вымушаны ўвесь час праяўляць даследчую, пошукавую актыўнасць, каб не застацца ў баку ад імкліва зменлівага грамадска-культурнага і прафесійна-вытворчага асяроддзя. Менавіта таму ў сучаснай адукацыі назіраецца надзвычай высокая цікавасць да даследчых і праектных метадаў вывучэння спецыяльных і гуманітарных дысцыплін, якія як раз скіраваныя на праяўлення самастойнай пазнавальнай актыўнасці навучэнцаў [2].

У адукацыйнай практыцы суіснуюць і шырока спалучаюцца пасіўныя, актыўныя і інтэрактыўныя стратэгіі. Умелае іх спалучэнне забяспечвае эфектыўнасць выкладання і дастаткова высокую якасць адукацыі. Да найбольш распаўсюджаных ў практыцы работы выкладчыкаў інавацыйных тэхналогій, на наш погляд, можна аднесці: 1) інфармацыйна-камунікатыўныя, скіраваныя на выпрацоўку камунікатыўных кампетэнцый; 2) тэхналогіі інтэрактыўнага навучання, якія прывучаюць студэнта да работы ў камандзе пры вырашэнні вучэбных і практычных задач; 3) праектныя тэхналогіі і тэхналогіі крытычнага мыслення, рэалізацыя якіх дазваляе навучэнцам самастойна выконваць праекты, вызначаць і аргументавана даказваць сваю пазіцыю, свой пункт гледжання, раскрываць творчы патэнцыял асобы, спрыяць яе самарэалізацыі і самавызначэнню.

Вызначальнай рысай падрыхтоўкі студэнтаў у вышэйшай навучальнай установе у цяперашні час павінна стаць яе накіраванасць на засваенне сітуацыі сацыяльных перамен, якія адбываюцца сёння і будуць адбывацца ў будучым. Той, хто выкладае гісторыю, заўсёды імкнецца падзяліцца з моладдзю звесткамі аб цікавых падзеях і перадаць ёй з чалавечага вопыту тое, што не страціла свайго значэння ў будучым, калі значнымі стануць толькі некаторыя гістарычныя факты падзеі і з’явы. Большасць таго, што змяшчае праграма па гісторыі асабліва па гісторыі сучаснасці, у аддаленай перспектыве страціць сваю актуальнасць.

Выкладчыкі ВНУ імкнуцца дабіцца ад студэнтаў засваення праграмнага матэрыялу і ў першую чаргу таго, які накіраваны на падтрыманне і ўзнаўленне існуючага сацыяльнага вопыту і сацыяльнай сістэмы. Усё гэта дакладна ўпісваецца ў рамкі

падтрымліваючага навучання, якое забяспечвае пераемнасць сацыяльна-культурнага вопыту. Менавіта ён з’яўляецца традыцыйна вызначальным як у школьным навучанні, так і ў навучанні ў ВНУ.

Традыцыйны падыход да падрыхтоўкі навучэнцаў ВНУ пакуль пераважае, што ў цэлым задавальняе большасць студэнта аб чым сведчаць вынікі праведзенага сярод студэнтаў апытання. Аналіз яго вынікаў паказвае, што толькі 8 % студэнтаў напісалі, што ад выкладчыкаў яны даведаліся мала новага, бо, часцей за ўсё, тыя не выходзяць за межы адпаведных падручнікаў. На лекцыях сумна, іх слуханне – марная трата часу. У інтэрнэце за гэты час можна прачытаць ў 3-4 разы больш інфармацыі, чым дае выкладчык на лекцыі. Выказвалася таксама незадаволенасць семінарскімі заняткамі, якія, на іх думку, зводзяцца да чытання рэфератаў і іх каменціравання, а часам да ўзнаўлення тэксту вучэбных дапаможнікаў. Вельмі рэдка, лічаць яны, выкарыстоўваюцца заснаваныя на прадуктыўнай дзейнасці інавацыйныя падыходы ў выкладанні сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Усё гэта сведчыць, што элементы інавацыйнага навучання пакуль што не з’яўляюцца вызначальнымі і выкарыстоўваюцца спарадычна, а не як сістэма. Таму гаварыць аб інавацыйным навучанні пры падрыхтоўцы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй рана. Яго можна разглядаць толькі ў плане пастаноўкі праблемы [1, с. 30].

Інавацыйнае навучанне, на думку М. В. Кларына, працэс і вынік такой вучэбнай і адукацыйнай дзейнасці, якая, акрамя падтрымання існуючых традыцый, стымулюе актыўны асабісты водгук навучэнца на ўзнікаючыя як перад асобным чалавекам, так і перад грамадствам праблемнныя сітуацыі [5, с. 27]. Зварот да такога разумения інавацыйнага навучання пашырае погляд на значэнне пошукаў у тэорыі і методыцы выкладання сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у тым ліку і гісторыі ў вышэйшых навучальных установах.

Цяжка ўявіць, каб практыка навучання у ВНУ заўсёды зводзілася да арганізацыі чыстай рэпрадукцыі. Тым больш нерэальна ўявіць сабе навучанне на выключна даследчай аснове, Хутчэй за ўсё гаворка павінна ісці аб накіраванасці навучання. Ва ўсім свеце ўсё большае распаўсюджванне атрымлівае арыентацыя на выкарыстанне інавацыйнага навучання, хаця на практыцы па-

ранейшаму пераважае падтрымліваючае [3, с. 7]. Гэта, на наш погляд, тлумачьшца непадрыхтаванасцю сістэмы адукацыі і грамадства да сутыкнення з новымі сітуацыямі сацыяльнага жыцця, непадрыхтаванасцю да своечасовага водгуку на ўзнікаючыя палітычныя, эканамічныя і іншыя праблемы. Ажыццяўленне інавацыйнага навучання гісторыі ў вышэйшай навучальнай установе магчымае, на нашу думку, пры выкананні наступных палажэнняў:

1. Усведамленне выкладчыкамі неабходнасці даследчай накіраванасці навучання і, у сувязі і гэтым, сваёй новай ролі ў арганізацыі навучальнага працэсу, якую коратка можна сфармуляваць так — больш слухаць, чым гаварыць, больш назіраць, чым паказваць, аказваць дапамогу ў рабоце навучэнцу, пазбягаючы задаваць ёй дакладна вызначаную накіраванасць [4, с. 37]. Роля выкладчыка ў навучанні пры гэтым не толькі не зніжаецца, а, наадварот, значна ўзрастае і ўскладняецца. Значна прасцей перадаць студэнту тое, што ведаеш сам, чым абудзіць яго цікавасць, стварыць устойлівую матывацыю да вывучэння свайго курса, ператварыць студэнта ў калегу, які з такім жа інтарэсам і зацікаўленасцю імкнецца адшукаць вырашэнне актуальных праблем у той ці іншай галіне гістарычнай навукі.

2. Даследчы характар навучання патрабуе ўсведамлення вядучай ролі семінарскіх і практычных заняткаў. Менавіта групавыя формы работы ствараюць неабходныя перадумовы ажыццяўлення інтэрактыўнай і пошукава-даследчай дзейнасці студэнтаў. Непасрэдныя камунікатыўныя адносіны ў групе дазваляюпь дасягнуць творчай атмасферы на занятках і арганізаваць прадуктыўную дзейнасць навучэнцаў. Неабходнасць арганізацыі такой дзейнасці ставіць выкладчыка ў складаную сітуацыю выбара праблемы, якая будзе актуальнай і цікавай для студэнтаў. Акрамя таго, абраная для заняткаў праблема павінна адпавядаць наступным патрабаванням: па-першае, яна павінна быць значнай, каб гарантавапь зацікаўленасць усёй групы; па-другое, яна павінна быць выразна сфармуляванай і мець шырокую інфармацыйную базу; і, па-трэцяе, дапускаць шырокі выбар варыянтаў і шляхоў яе вырашэння.

3. Даследчы, творчы характар навучання сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, заснаваны на ідэі апоры на ўласны вопыт

навучэнца. Гэта забяспечвае цэласную ўключанасць студэнта ў вучэбны працэс, якая праяўляецца не толькі ў выразна акрэсленых і рацыянальных дзеяннях, але і ў інтуітыўных, якія вызначаюцца папярэднім вопытам і ведамі. У такім выпадку педагог становіцца арганізатарам самастойнага вучэбнага пазнання. Узаемадзеянне навучэнцаў з вучэбным матэрыялам, адзін з адным і выкладчыкам будуецца як вучэбна-пазнавальнае, у якім выкладчык з'яўляецца адной з крыніц інфармацыі і адным з суб'ектаў працэсу навучання, які ў сумеснай дзейнасці імкнецца да аптымальнага вырашэння праблемы [4, с. 117].

4. Улік азначаных вышэй палажэнняў з'яўляецца толькі асновай укаранення інавацыйных падыходаў у практыку навучання гісторыі і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ў вышэйшай навучальнай установе. Арганізацыя вывучэння гісторыі як сістэматычнага гістарычнага даследавання залежыць ад шэрагу аб'ектыўных і суб'ектыўных умоў. Па-першае, яна патрабуе наяўнасці адпавядаючай часу шырокай інфармацыйнай базы, даступнай студэнтам (літаратуры, першакрыніц, камп'ютарнага забеспячэння і г. д.); па-другое, гатоўнасці выкладчыка да арганізацыі такога навучання, г.зн. наяўнасці ў яго не толькі прафесійнай эрудыцыі, але і ўмення арганізаваць актыўную самастойную пазнавальную дзейнасць студэнтаў; па-трэцяе, імкнення саміх студэнтаў да творчага авалодання гістарычнай навукай; па-чацвёртае, перагляду вучэбных планаў вышэйшых навучальных устаноў з мэтай скарачэння колькасці лекцый і павелічэння долі семінараў і практычных заняткаў, а таксама часу на самастойную работу з разнастайнымі крыніцамі інфармацыі.

Нават тады, калі пералічаныя вышэй абставіны не сталі рэальнасцю, у межах традыцыйнага падтрымліваючага навучання ёсць пэўныя магчымасці выкарыстоўваць элементы інавацыйных тэхналогій: такіх як праблемнае навучанне, ролевыя і імітацыйна-мадэліруючыя гульні, выкарыстанне элементаў пошукавай мадэлі навучання і г. д. Досвед выкарыстання гэтых форм працы на занятках паказаў, што іх выкарыстанне дазваляе навучэнцам развіць навыкі міжасобаснага ўзаемадзеяння, набытыя студэнтамі ў іншых відах дзейнасці, уменне і здольнасць да прадуктыўнай дзейнасці, агульны ўзровень псіхічнага развіцця. Маладыя людзі пачынаюць вольна аперыраваць ведамі, лепш засвойваюць прычынна-следчыя,

лакальныя і храналагічныя сувязі, выяўляць і выкарыстоўваць для аналізу фактаў мінулага і сучаснасці гістарычныя заканамернасці.

Разнастайнасць формаў і метадаў арганізацыі семінараў павялічвае цікавасць навучэнцаў да прадмета, фармуе іх гістарычная і грамадзянскую свядомасць. Неабходна шырэй і больш актыўна ўкараняць у практыку інтэрактыўнае навучанне (такія інтэрактыўныя методыкі, як «кілімок ідэй», «дрэва рашэнняў», «шэсць капялюшоў мыслення» і г.д.), паколькі гэта адмысловая форма арганізацыі практычнай і творчай пазнавальнай дзейнасці.

**Выкарыстаная літаратура**

1. Багдановіч, І. І. Інавацыйныя падыходы ў падрыхтоўцы настаўнікаў гісторыі/І.І. Багдановіч. // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2000. – № 4. – С. 29 – 33.

2. Бухвалев, В. А. Технология работы учителя-мастера / В.А. Бухвалев. – М.:ВЛАДОС, 1995. – 214 с.

3. Запрудский, Н. И. Моделирование и проектирование авторских дидактических систем / Н. И. Запрудский. – Минск: “Сэр-Вит”, 2008. – 336 с.

4. Запрудский, Н. И. Современные школьные технологии - 2 / Н. И. Запрудский. – Минск: “Сэр-Вит”, 2010. – 256 с.

5. Кларин, М. В. Инновации в мировой педагогике / М.В. Кларин. – М.: Просвещение, 1995. – 221с.

6. Селевко, Г.К. Современные образовательные технологии: Учебное пособие / Г.К. Селевко. – М.: Народное образование, 1998. – 267с.